

# МІНШЧЫНА Ў ТВОРЧЫМ ЛЁСЕ Ф. РУШЧЫЦА

**А. М. ДЗМІТРУК,**
*аспірантка каф. тэорыі і гісторыі культуры*
*(БДПУ імя Максіма Танка)*

**Т. Ф. СУХОЦКАЯ,**
*дац. каф. тэорыі і гісторыі культуры*

Фердынанд Рушчыц — мастак, які спалучыў у сваёй творчасці лепшыя рысы дзвюх культур — беларускай і польскай, які стаў першаадкрывальнікам іх этнаграфічнай і мастацкай блізкасці. Сваім талентам і жыццём Ф. Рушчыц актуалізаваў праблему польска-беларускіх культурных сувязей і сёння дапамагае адчуць нашу духоўную еднасць. Пацвярджэнне гэтаму — запіс у дзённіку: «...глыбока ўва мне сядзяць традыцыі... каталіцызму, нашага Захаду. Таму для расейцаў мы застанёмся чужымі, хоць мы славяне. І з гэтымі нашымі традыцыямі нам не след парываць... У гэтым наша своеасаблівасць» [1, с. 65]. Спадчына выдатнага мастака, пейзажыста, дэкаратара, графіка ў пэўнай ступені можа лічыцца здабыткам як беларускага, так і польскага народа.

Род Рушчыцаў бярэ пачатак ад старажытнабеларускай праваслаўнай шляхты — Рошчыцаў, якая ў часы Рэчы Паспалітай прыняла каталіцызм. Прозвішча Рошчыч трансфармавалася на польскі лад у Рушчыц. У XIX ст. сям'я належала да каталіцкай канфесіі, але з XVI—XVIII стст. былі фамільныя сувязі з «грэцкай верай», праваслаўем, кальвінізмам, евангелізмам-рэфарматарствам. Сам Ф. Рушчыц лічыў сябе «тутэйшым» [2, с. 226]. Феномен саманазвы «тутэйшы» — не толькі вынік дэнацыяналізацыі вясковага насельніцтва, але і сведчанне ўпартага жадання адасобіцца ад суседніх народаў, устойлівы кампанент мужыцкай ментальнасці. Ва ўмовах шматвяковага бездзяржаўнага існавання ў беларускага селяніна былі разбураны каштоўнасныя грамадзянскія арыенціры. Прастору свайго жыццядзеяння сялянства абмежавала родным кутом і асвечанай уласнай працай зямлёй. «Тутэйшасць» Ф. Рушчыца дапаўнялася шыкоўным валоданнем беларускай мовай (адзін з вызначальных кампанентаў нацыянальнай прыналежнасці).

Нарадзіўся Ф. Рушчыц у 1870 г. у маёнтку Багданава Ашмянскага павета былой Віленскай губерні ў сям'і збяднелага шляхціца Эдуарда Рушчыца. Дзяцінства і юнацтва жывапісца прайшло ў горадзе Мінску, дзе бацька працаваў чыноўнікам на Лібава-Роменскай чыгунцы. У жыцці і творчасці Ф. Рушчыца Мінск стаў не толькі першым горадам, куды трапляе юнак, але і тым месцам, дзе пачынае фарміравацца яго творчая манера. Тут ён вучыўся ў гімназіі і асобна — маляванню ў Кузьмы Якаўлевіча Ермакова, выхаван-



Млын зімой. 1897. П., а. 56×41 см

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ



Дом у Багданаве. 1901

ца Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Ва ўспамінах Ф. Рушчыца гэты горад стане і месцам адпачынку ў час студэнцкіх канікул, прытулкам мрояў і летуценняў («Мінск зімою», 1898). Любоўю да Мінска, яго гісторыі дыхаюць эцюды занядбалых яўрэйскіх могілкаў і замалёўкі квітнеючых яблынь.

У 1890 г. Ф. Рушчыц заканчвае гімназію з залатым медалём і паступае на юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Але схільнасць да мастацкай творчасці хутка прыводзіць яго ў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў на аддзяленне жывапісу. Яму пашчасціла вучыцца ў перадавых рускіх мастакоў-дэмакратаў — І. Шышкіна і А. Куінджы. Хаця на працягу ўсёй сваёй творчасці Ф. Рушчыц застаецца прыхільнікам рэалістычнага жывапісу, аднак яго мастацкая манера ўзбагачаецца дасягненнямі постімпрэсіянізму, экспрэсіянізму, сімвалізму. У стылі заўсёды будзе адчувацца асаблівы ўплыў віленскай, мінскай школ, беларускай народнай творчасці.

Плённай была і навукова-педагагічная дзейнасць Ф. Рушчыца. Ён займаў пасаду прафесара ў Школе прыгожых мастацтваў у Варшаве, выкладаў у Кракаўскай акадэміі мастацтваў, быў прафесарам і дэканам Віленскага універсітэта. Яго вучнямі былі Язэп Драздовіч, Пятро Сергіевіч, Язэп Горыт. Мастак актыўна ўдзельнічае і ў шматлікіх культурных акцыях. Пра трывалыя стасункі Ф. Рушчыца з колам дзеячаў і літаратараў беларускіх выданняў сведчыць факт супрацоўніцтва з газетай «Наша ніва», выданне «Беларускага календара» на 1911 г. з ягонай вокладкай. Мастак змясціў на ёй званіцу ў беларускім стылі. У 1911 г. Ф. Рушчыц выдае часопіс «Тыднёвік віленскі» на польскай мове (хутка быў забаронены царскім рэжымам). У тэатры на Лукішках мастак арганізоўвае вечары паэзіі, прысвечаныя Адаму Міцкевічу, наладжвае кірмашы народнага мастацтва, афармляе шэраг спектакляў у тэатры Н. Младзяёўскай-Шчуркевіч («Ліля Венеда», 1909, «Князь Нязломны», 1910, «Баладына», 1914 Юльюша Славацкага; «Вяселле», 1910, «Варшавянка», 1914 і «Лістападаўская ноч», 1930 С. Выспянскага).

На мяжы XIX—XX стст. выпрацоўваюцца нацыянальныя стэрэатыпы ў мастацтве, фарміруецца нацыянальны стыль у беларускім жывапісе (К. Альхімовіч, Н. Сілівановіч, А. Гараўскі, В. Бялыніцкі-Біруля, С. Жукоўскі). На думку культуролага А. Пяткевіча, «спалучэнне рамантычнага і рэалістычнага пачаткаў у творчасці мастакоў, станаўленне «паэтычнага» рэалізму, уласцівага менавіта беларускаму жывапісу, адпавядала светаадчуванню шырокіх мас грамадства, асабліва краёвай інтэлігенцыі» [3, с. 151].

Крыніцу нацыянальнай сімволікі адраджэнцы бачылі ў народным дэкаратыўным мастацтве. Адметнасць мастацкага працэсу выяўлялася праз свядомы зварот мастакоў да міфалагічных тэм і архетыпічных вобразаў, праз перайманне асвет-



Пустка (Старое гняздо). 1901. П., а. 89×112 см

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных ідэалаў. Агульназразумелыя мастацкія сімвалы былі сфарміраваны пад уплывам рамантызму і шматзначнай сімволікі мадэрну. Актуальнай мастацкай формай стаў жанр краявіду.

Мастацкая манера Ф. Рушчыца фарміравалася пад уплывам розных мастацкіх традыцый, стыляў, але творчыя імпульсы назапашваліся менавіта на радзіме. Млын, студня, азярод, саламяная страха, мост, дрэвы, аблокі — знакі роднай зямлі, характэрныя вобразы мастацкага свету Ф. Рушчыца.



Старыя яблыні. 1900. П., а. 85×165 см

Тэма вясковага абуджэння прыроды як сімвал абнаўлення жыцця дамінавала ў творчасці ранняга Ф. Рушчыца: «Вясна» (1897), «Ручай» (1899), «Ля касцёла» (1899). У апошнім творы мастак уводзіць у краявід людскія постаці і праз іх раскрывае сімволіку твора. Філасофская развага пра месца чалавека ля храма ў жыцці падаецца праз асобу сівога старца, праз купку ўкленчаных вернікаў. Багданаўскі касцёл Міхаіла Архангела сінтэзаваў шматлікія традыцыйныя рысы беларускага драўлянага дойлідства. Просты вясковы касцёл — светлая містэрыя жыцця, сімвал вечнасці. Верыцца, што эфемерную мітусню ценяў пераможа сонечнае святло, пераможа не слабасць чалавека, а яго моц...

Менавіта ў маёнтку Багданава мастак стварае самыя лепшыя творы: «Зямля» (1898), «У свет» (1901), «Эмігранты» (1902) і інш. Пейзажы аб'яднаны адзіным філасофскім зместам, глыбокім сацыяльным падтэкстам, ствараюць трыпціх пакутнага лёсу беларускага народа. «Зямля» — гімн штодзённай працы земляроба, метафара ўсёй крэатыўнай дзейнасці чалавека, увасабленне патрыятычных настрояў мастака. Архетыпічны вобраз аратага, папулярны сярод мастакоў беларускага нацыянальнага адраджэння, экспрэсіўны, сімвалічны і рэалістычны адначасова. Чалавек звязвае неба і зямлю сваёй працай, сваім жыццём. Імкненне невымернымі сіламі стварыць зямную казку — выклік нябёсам. Матыў блуканняў, жабрацтва, пошуку шляхоў да вольнай Беларусі гучыць у пейзажах «У свет», «Эмігранты». Выгнаннікі з роднай зямлі, забраная Бацькаўшчына — рэаліі імперскай палітыкі.

Родная Міншчына, яе невыказная прыгажосць захапляе мастака. Лірычны пейзаж у «Млыне», «Лясным ручаі», «Берагах Вілейкі» эмацыянальна прыўзнятыя, меладычныя. Найвышэйшага ўздыму майстэрства каларыста дасягае ў эцюдах «Зіма», «Зімовая казка», «Мастак». У гэтых творах Ф. Рушчыц паэтызуе беларускую прыроду. Сімвалічна, што і апошні твор свайго жыцця мастак стварае таксама ў Багданаве. «Старыя яблыні» — філасофская алегорыя аб лёсе чалавека, аб лёсе Бацькаўшчыны. Гэта сімвал пакутнага шляху да зямной «казкі жыцця».

Фердынанд Рушчыц паўстае са сваіх карцін як патрыёт, адданы сын роднай мінскай зямлі, чалавек актыўнай грамадзянскай пазіцыі, апостал духоўнасці.

1. *Рушчыц, Ф.* Дзённік. Запіс ад 26.01.1903 // Мастацтва. 1996. № 2. С. 56—66.
2. *Дробов, Л. Н.* Живопись Белоруссии XIX — начала XX в. Минск, 1970.
3. *Пяткевіч, А. М.* Стыль беларускай культуры: пытанні развіцця і ідэнтыфікацыі // Праблемныя напрамкі развіцця мастацкай творчасці і вербальнай культуры нацыі : матэр. Міжнар. навук. канф. Мінск, 2004. С. 150—151.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ